Мамчыц В. С., студ. Гр. 111 “А” ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бабко А.І.,
канд. філас. навук, дацэнт

# БІЯЭТЫКА: ПРАБЛЕМА ЭЎТАНАЗІІ

Праблема эўтаназіі мае ў якасці сваёй філасофскую праблему жыцця і смерці. Гэта дапушчэнне змушае нас разглядзець больш пільна філасофскія аспекты дадзенай тэматыкі, якія нярэдка ігнаруюцца ў адпаведных дыскусіях. Але яны надта важныя і не павінны ігнаравацца.

Эўтаназію можна азначыць наступным чынам: гэта намернае дзеянне ці бяздзеянне медыцынскага супрацоўніка, што адбываецца ў выпадку яўнай і недвусэнсова выражанай просьбы інфармаванага хворага  ці яго законнага прадстаўніка з мэтай заканчэння фізічных і псіхічных пакут хворага, які знаходзіцца па медыцынскіх паказаннях у стане, што пагражае жыццю і пасля якога павінна наступіць смерць.

Сучасная медыцына дасягнула высокага ўзроўню развіцця. Тым не менш яна незаўжды можа забяспечыць нармальную якасць жыцця пацыента. Таму і паўстае праблема эўтаназіі. У сучасных умовах вылучаюць актыўную і пасіўную, дабраахвотную і прымусовую эўтаназію.

*Пасіўная* эўтаназія ( ці як яе яшчэ называюць “ метад адкладзенага шпрыца”) выяўляецца ў тым, што спыняецца аказанне  накіраванай на выратаванне жыцця медыцынскай дапамогі, што паскарае наступленне смерці. На практыцы гэта дастаткова часта сустракаецца і ў нашай краіне.

Пад *актыўнай* эўтаназіяй ( “ метад напоўненага шпрыца” ) разумеюць увядзенне хвораму якіх- небудзь лекавых ці іншых сродкау, а таксама іншыя дзеянні, што цягнуць за сабой хуткае і безбалючае наступленне смерці (смяротная ін’ екцыя). Формы актыўнай эўтаназіі: а) “забойства з міласэрнасці”- адбываецца ў тых выпадках, калі ўрач бачыць жахлівыя пакуты безнадзейнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хворага чалавека і, не маючы магчымасці дапамагчы яму, уводзіць вялікую дозу абязбольваючага прапарата; б) “ самагубства, якое асістыруецца ўрачом”- адбываецца, калі ўрач толькі дапамагае безнадзейна хвораму чалавеку скончыць жыццё; в) актыўная эўтаназія можа праходзіць і без ўрача, калі пацыент сам уключае патрэбнае абсталяванне, як бы сам накладвае на сябе рукі.

*Дабраахвотнай* называецца эўтаназія, якая адбываецца па недвусэнсоўнай просьбе хворага, ці яго папярэдне выказанай згоды.

*Прымусовая* эўтаназія адбываецца без згоды хворага.

Эўтаназія ўключае ў сябе цэлы комплекс узаемазвязаных аспектаў, сярод якіх звычайна вылучаць: філасофскі, этычны, рэлігійны, біямедыцынскі, юрыдычны.У філасофскім і этычным плане асабліваe значэнне мае праблема яго суадносін з гуманістычнымі і духоўнымі прынцыпамі.Але, які ён сапраўдны гуманізм, калі яго разглядаць у кантэксце эўтаназіі?

Многія сучасныя практыкі і навукоўцы забываюць пра гуманізм. Сучасная цывілізацыя забяспечыла для чалавека камфортнае існаванне, а цяперашні “гуманізм” забяспечвае бесклапотнае жыццё і такі ж самы бесклапотны сыход з гэтага жыцця, у выглядзе эўтаназіі.

Аўтар дадзенага тэкста правяла сацыяльнае пытанне па дадзенай праблеме, і ў выніку высветлілася: 55% апытаных адказалі, што яны супраць эўтаназіі, 40%- за, а 5%- абыякавыя.Многія з апытанных сцвярджаюць, што калі чалавек стары, ці атрымлівае жудасны боль, то навошта яму пакутаваць? А іншыя запярэчаць, што існуюць духоўнасць і этыка, што эўтаназія не што іншае, як забойства.На маю думку, аднак, калі чалавек смяротна хворы яго трэба падтрымліваць, паколькі сапраўдны гуманізм- гэта змаганне за жыццё.

На гэты конт ёсць прыклад: малады чалавек трапіў у аўтакатастрофу і ляжаў у коме. Урачы лічылі, што гэта безнадзейны выпадак, ад яго ўсе адвярнуліся, акрамя адной сяброўкі. Яна яго маральна падтрымлівала, была каля яго, і праз 2 тыдні ён прыйшоў у сябе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звычайна людзі, якія выступаюць супраць эўтаназіі, звяртаюцца да прынцыпу святасці жыцця як унікальнага феномену. Кант выступае з філасофскім абгрунтаваннем гэтай унікальнасці, даводзячы, што мы павінны заўжды разглядаць разумныя істоты як канчатковую мэту, а не сродак для чаго-небудзь іншага. Я не маю права перапыняць жыццё іншага чалавека толькі таму, што яно цяжкае для яго. Паводле прынцыпу святасці жыцця для тых, хто яго прытрымліваецца, эўтаназія- гэта няправільна ў любых абставінах.

Калі чалавек памірае сваёй смерцю, гэта цяжка і складана перажыць. А калі разумееш, што яго забілі, ад гэтага становіцца страшна і яшчэ больш балюча. Эўтаназія і ёсць усвядомленае прычыненне смерці. Крымінальнае права нашай краіны разглядае эўтаназію як забойства, і я лічу, што гэта вельмі адэкватнае значэнне. Намер відавочны: забіць чалавека. Людзі, якія ідуць на забойства- гэта ўжо не людзі, і ім самім патрэбна медыцынская дапамога.

І ўсё ж такі гэта пытанне аб эўтаназіі да канца не вырашана. І, магчыма, яго нельга вырашыць адназначна, заўжды па ім будуць весціся спрэчкі і дыскусіі.

Спіс літаратуры:

1. Аўраменка, В. Самагубства і эўтаназія.// В. Аўраменка.- Arche. Пачатак.- 2007- № 12.- с. 92- 98.

Місевіч, В. Мяжа чалавечае годнасці.// В. Місевіч.- Arche. Пачатак.- 2007.- № 12.- с. 98- 102.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ